# Мая Радзіма – Беларусь

Аўтар: Сабасцьян Мацвей
Міхайлавіч, вучня VI класа,
дзяржаўная установа адукацыі
“Сярэдняя школа №3 г.Масты”

Беларусь! Для мяне гэта не проста слова, заўсёды вымаўляю яго з асаблівым трапяткім пачуццём, пачуццём шчасця, трывогі, болю, любові, адказнасці і гонару.

З пачуццём шчасця, бо сапраўды адчуваю сябе шчаслівым чалавекам. Шчаслівым, бо нарадзіўся ў самай дзівоснай, загадкавай, казачнай краіне. Так, самай дзівоснай, загадкавай, казачнай!

Дзівоснай сваімі шыкоўнымі ляснымі абшарамі, дзе кожную вясну мяне сустракаюць пяшчотныя пралескі. Загадкавая сваімі чароўнымі лугамі, дзе вабяць жоўтымі вочкамі беларускія рамонкі, а вясёлыя дзьмухаўцы сваімі пухнатымі парасонамі запрашаюць у дзівоснае падарожжа па маёй краіне. Так хочацца ўзняцца ў неба высока-высока на гэтым дзіўным парасоне, каб палюбавацца краявідамі сваёй Радзімы.

Загадкавая мая Радзіма… Кожную раніцу яна падаецца мне загадкавай. Загадкавай промнямі майго беларускага сонейка. Промнямі, якія рознымі адценнямі колераў гуляюць у маіх вейках. Промнямі, якія кожную раніцу лашчаць маю зямлю, абуджаючы яе ад начнога сну. А яшчэ загадкавая сваімі кропелькамі празрыстай расы, прыроднымі слёзкамі. Загадкавая божай кароўкай, якая ціхутка спаўзае з барадатай асакі. Дзівосная шырокім бусліным крылом, якое закрывае паўнеба. Дзівосная салодкім пахам рапсу і блакітнымі вочкамі льну. Дзівосная плывучым танцам лебядзінай сям’і, даверлівай удзячнасцю лясных аленяў, трапяткім разлівам ракі і птушынымі спевамі. Дзівосная водарам вясковага паветра, якога, здаецца, не можаш наглытацца. Дзівосная цікаўнасцю беларускіх птушак, якія заўсёды суправаджаюць мяне ў дарозе і нібыта сочаць за мною, пералятаючы з дрэва на дрэва, абганяюць, чакаюць і зноў пералятаюць. Дзівосная сямействамі лясных жыхароў, якія часта трапляюцца на маім шляху ў лясной пушчы. Дзівосная сваімі людзьмі, якія заўсёды недзе спяшаюцца часам прыпыняюцца ля квітнеючых галінак бэзу, расплываючыся ва ўсмешцы асалоды. У такія моманты здаецца, што не толькі ты шчаслівы, а ўсе вакол цябе шчаслівыя.

А зусім нядаўна мая родная зямелька стагнала ад рваных ваенных ран, захлыналася ў крывавых рэках бяды, глыбокімі страшнымі людскімі крыкамі напаўнялася яе сэрца. І ў кожнай мясцовасці маёй краіны балючы ўспамін той крывавай вайны – абеліск. Абеліск, да якога не зарастае травой дарога…і не можа зарасці, бо мой беларускі народ моцны сваёй гістарычнай памяццю! Абеліск, дзе кожны раз падчас хвіліны “маўчання” праплывае жураўліны клін. Жывы, ціхі ўспамін – жураўліны клін…

І так хочацца ў такія хвілінкі абняць цябе, мая родная старонка, абняць, прытуліць да сваіх грудзей і не адпускаць, каб ніхто ніколі-ніколі не змог цябе больш пакрыўдзіць! Бо ты як не якая іншая заслужыла спакой, цішыню, мір, любоў і павагу за сваё цярпенне, сваю дабрыню, сваю непакорнасць.

"Беларусь – мая Радзіма!" – з гонарам падыму галаву і моцна зноў і зноў скажу гэтыя словы. "Беларусь – мая Радзіма!" – звонкім беларускім рэхам адгукнуцца словы. "Беларусь – мая Радзіма!" – шчырае пачуццё павагі да сваёй Радзімы пранясу праз усё жыццё.